

**20.** Прачытайце. Спішыце. Падкрэсліце ў словах літару ***і***.

У Ноны і Ніны — ніткі і тканіна. *(С. Шах.)*

## Апостраф (’)



**21.** Прачытайце словы.

*верабей* *вераб’і*



Якім з прапанаваных слоў можна падпісаць малюнак? Назавіце па парадку гукі ў гэтым слове. Які знак пішацца ў слове *вераб’і*?

**Завяжы вузялок!**

Апостраф не літара, а надрадковы знак.

Там, дзе ў слове стаіць апостраф, пры чытанні вымаўляецца гук [й].

**22.** Запішыце словы з апострафам.






Правообладатель Национальный Институт образования

**23.** Прачытайце. Які знак ёсць ва ўсіх словах?

| | | |
|---|---|---|
| з’езд | б’е | пер’е |
| аб’езд | п’е | вераб’і |
| пад’езд | з’ем | вераб’іны |

З адным словам вусна складзіце сказ.

**24.** Прачытайце верш. Што такое апостраф?

### Апостраф

Вось апостраф. Гэта знак.
Вельмі важны ён аднак.
*З’езд*, *пад’езд* напішам проста,
Калі ўспомнім пра апостраф.

*А. Вольскі.*

Выпішыце словы з апострафам.

**25.** Прачытайце загадку.

З вераб’інае яечка
ён велічынёю,
а жыве тут дуб вялізны
да хмар вышынёю.

*І. Муравейка.*




З літар складзіце слова-адгадку. Выпішыце з загадкі слова з апострафам.



Правообладатель Национальный Институт образования



**26.** Паслухайце верш.

## Рассмяшыў Вася

Рассмяшыў сягоння ў класе
нас сваёю байкай Вася.
Ён сказаў: «З сястрычкай Дашай
салаўя кармілі кашай.
Салавейка кашу з’еў,
чык-чырык — на грушу сеў».
Мы ўсім класам закрычалі:
«Вераб’я вы частавалі».

*В. Кудлачоў.*

Якіх птушак пераблытаў Вася? Як дзеці здагадаліся, што Вася частаваў вераб’я?

Знайдзіце і прачытайце словы з апострафам.

**27.** Дапоўніце сказы патрэбнымі словамі.

| | |
|---|---|
| У вераб’я вялікая ... | пер’е |
| У сарокі прыгожае ... | сям’я |

Запішыце сказы. Назавіце словы з апострафам.



Правообладатель Национальный Институт образования



**28.** Прачытайце прыказку. Чаму так гавораць?

Прыгожая птушка пер’ем, а чалавек вучэннем.

Спішыце. Падкрэсліце слова з апострафам.

## Гукі [г], [г’], літары *Г, г*



**29.** Разгледзьце малюнак. Прачытайце скорагаворку.




Пад галінамі яліны гномы гаманілі.

Прачытайце, што гаварылі гномы.

**Завяжы вузялок!**

Гукі [г], [г’] у беларускай і рускай мовах вымаўляюцца па-рознаму, але на пісьме абазначаюцца адной і той жа літарай.



Правообладатель Национальный Институт образования